Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

Гістарычны факультэт

# АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ГІСТАРЫЯГРАФІІ АЙЧЫННАЙ І СУСВЕТНАЙ ГІСТОРЫІ

*Зборнік навуковых прац*

Мінск 2012

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Члены Государственной думы (портреты и биографии). Первый созыв. 1906–1911 гг. (Сессия продолжалась с 27 апреля по 9 июля 1906 г.) / сост. М.М. Бокович. – М.: Издательство товарищества И.Д. Сытина, 1906. – 512 с.
4. Члены Государственной Думы (портреты и биографии). Третий созыв. 1907–1912 гг. / сост. М.М. Бонович. – 2-е изд. – М.: Тип. товарищества И.Д. Сытина, 1908. – 456 с.
5. *Шульгин, В.* Годы – Дни – 1920 / В. Шульгин. – М.: Новости, 1990. – 828 с.
6. *Шелохаев, В.В.* Партия октябристов в период первой российской революции / В.В. Шелохаев. – М.: «Наука», 1987. – 160 с.
7. *Шелохаев, В.В.* Либеральная модель переустройства России / В.В. Шелохаев. – М.: РОССПЭН, 1996. – 280 с.
8. История политических партий России / под ред. А.И. Зевелева. – М.: «Высшая школа», 1994. – 446 с.
9. Политические партии и политическая полиция. Документальное исследование: в 3 ч. / под общ. ред. Э.М. Энтина. – Гомель, 1996. – 450 с.
10. Становление и крушение однопартийной системы в СССР / под общ. ред. Э.М. Энтина. – Гомель: ИПП «Техническая книга», 1995. – 506 с.
11. *Сташкевіч, М.С.* Перадумовы і працэс стварэння палітычных партый на Беларусі (канец XIX ст. – люты 1917 г.) / М.С. Сташкевіч // Белар. гіст. часоп. – 1999. – № 3. – С. 18 – 23.
12. *Біч, М.* Беларускае адраджэнне ў XIX – пачатку XX ст. Гістарычныя асаблівасці і ўзаемаадносіны з іншымі народамі / М. Біч. – Мінск: «Навука і тэхніка», 1993. – 30 с.
13. Институт выборов в истории России. Источники, свидетельства современников. Взгляды исследователей XIX – начала XX вв. / авт.-сост. Ю.А. Веденеев, И.В. Зайцев, В.И. Луговой; под общ. ред. А.А. Вешнякова. – М.: Издательство НОРМА, 2001. – 784 с.
14. *Забаўскі, М.М.* Расійская Дзяржаўная дума ў лёсах Беларусі (1906–1917 гг.): манаграфія / М.М. Забаўскі. – Мінск: БДПУ, 2008. – 267 с.
15. *Лавринович, Д.С.* Деятельность конституционно-демократической партии и «Союза 17 октября» в Беларуси (1905–1918 гг.): монография / Д.С. Лавринович. – Могилев: УО «МГУ им. А.А. Кулешова», 2009. – 336 с.
16. Гістарыяграфія гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст.: праблемы, здабыткі, перспектывы / Н.Ф. Анофранка [і інш]; навук. рэд. В.В. Яноўская. – Мінск: Беларуская навука, 2006. – 447 с.
17. *Карев, Д.В.* Белорусская и украинская историграфия конца XVIII – начала 20-х гг. XX в. В процессе генезиса и развития национального исторического сознания белорусов и украинцев / Д.В. Карев. – Вильнюс: Европейский гуманитарный университет, 2007. – 312 с.

## НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПЫТАННЕ Ў ПРАГРАМАХ І ДЗЕЙНАСЦІ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ І ГРУП У БЕЛАРУСІ Ў 1905 – ЛЮТЫМ 1917 г. (ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ДАРЭВАЛЮЦЫЙНАГА ПЕРЫЯДУ)

***П.А. Трубчык, г. Мінск***

Праблематыка пастаноўкі нацыянальнага пытання ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі ў 1905 – лютым 1917 гг. разглядалася галоўным чынам пры даследаванні гісторыі некаторых палітычных партый, а таксама нацыянальных рухаў азначанага перыяду. Выключэнне складаюць публікацыі, дзе нацыянальнае пытанне выступае ў якасці самастойнага аб'екта даследавання, аднак разглядаецца толькі ў агульнаімперскім кантэксце.



Яшчэ ў дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі разгарнулася тэарэтычная распрацоўка задач нацыянальнага будаўніцтва ў Расійскай імперыі. Фармуляванне партыйных праграм і перадвыбарчых платформ становіцца сур'ёзным стымулам для з'яўлення публікацый, якія прапагандавалі вырашэнне нацыянальнага пытання ў Расіі на аснове раўнапраўя, культурна-нацыянальнай і абласной аўтаноміі, федэрацыі. Адным з ідэолагаў шырокай дэцэнтралізацыі Расійскай імперыі, прыхільнікам аўтаноміі стаў вядомы прававед і тэарэтык Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі (КДП) Ф.Ф. Какошкін. У кнізе «Автономия, федерация и национальный вопрос», якая была выдадзена пад рэдакцыяй яшчэ аднаго тэарэтыка канстытуцыяналізму, абранага ў 1907 г. дэпутатам II Дзяржаўнай думы У.М. Гесена, разам з прынцыпамі аўтаноміі і федэрацыі, сцвярджалася неабходнасць надання для кожнай нацыянальнасці «права на самавызначэнне ў пытаннях культуры» [1, с. 4].

З пазіцый аўтаноміі, спосабаў разумнай дэцэнтралізацыі падыходзіў да праблемы ўзаемаадносін тэрыторый і народаў, якія іх насяляюць у шматнацыянальнай дзяржаве, вядомы ўкраінскі мысліцель М.П. Драгаманаў. Ён стаяў на платформе шырокага канстытуцыяналізму, адстойваў ідэю раўнапраўя нацый, крытыкаваў бюракратычныя дзеянні самаўладдзя. У той жа час, займаючы пазіцыю шырокага прызнання аўтаномных правоў палітычных, сацыяльных і нацыянальных груп, быў безумоўным праціўнікам нацыянальнага сепаратызму. Драгаманаў рашуча адмаўляў нацыяналізм і ўвогуле любую нацыянальную выключнасць, выступаючы за розныя формы салідарнасці паміж людзьмі. Пры гэтым, нацыянальную салідарнасць ён разглядаў як асноўны сродак для ажыццяўлення вышэйшых сацыяльных і палітычных ідэалаў цывілізацыі [13, с. XIII, XVI, XXXIII–XXXVII].

Пазіцыі М.П. Драгаманава падзяляў яго зямляк, ідэолаг дасягнення ўкраінскай аўтаноміі М.С. Грушэўскі. Крытыкуючы нацыянальную палітыку царызму, тым не менш ён адзначаў, што «імкненне да стварэння ўласнай дзяржавы народнасць можа ўтрымліваць толькі разуменне таго, што прыналежнасць да дадзенага дзяржаўнага саюза дае дастаткова значныя выгоды – перш за ўсё, у эканамічным і культурным развіцці народаў, якія ўваходзяць у яго склад. Калі ж, – працягваў сваю думку Грушэўскі – маюцца ўмовы для развіцця нацыянальнага жыцця, або ў форме федэрацыі, ці добра арганізаванай аўтаноміі, якая гарантуе ад прыцясненняў і эксплуатацыі, то ў такім выпадку выгоды ад уваходжання ў склад адзінай дзяржавы відавочны» [11, с. 4, 6, 10–12].

У дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі даволі шмат прац, дзе ў той ці іншай ступені разглядаецца нацыянальная праблематыка. Адну з першых спроб сістэматызацыі і гістарыяграфічнага апісання гэтых прац зрабіў вядомы бібліёграф М.А. Рубакін. У адным з сваіх выпускаў «Среди книг» ён вылучыў вялікую рубрыку, дзе ў тэарэтычным аспекце ахарактарызаваў публікацыі па праблемах нацыянальных адносін у Расійскай імперыі [28, с. 100–189]. Адзначым найбольш паказальныя з іх.

Шэраг аўтараў кансерватыўна-манархічнага кірунку займалі шавіністычныя пазіцыі і адкрыта прапагандавалі лозунг «Расія для рускіх» [2; 7–8; 22]. Аднак



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нават сярод прадстаўнікоў манархічнага лагера выказваліся заўвагі супраць «неабгрунтаванага абмежавання нацыянальнай самабытнасці далучаных народнасцей», падкрэслівалася неабходнасць больш гібкага лавіравання царызму ў нацыянальным пытанні [14; 31].

У ліберальнай гістарыяграфіі мелі месца розныя падыходы ў вырашэнні нацыянальнага пытання – ад «нацыянальна-ліберальнага імперыялізму», прадстаўленага перш за ўсё працамі П.Б. Струвэ, які хоць і крытыкаваў нацыяналізм, усё ж такі адмаўляў у праве на аўтаномію шэрагу народаў Расійскай імперыі, напрыклад беларусам і ўкраінцам [30]; да дэмакратычнага, які прадугледжваў магчымасць вырашэння нацыянальных праблем у агульнаграмадзянскім кантэксце, перш за ўсё задавальненнем нацыянальна-культурных патрабаванняў народаў [10; 20].

Нацыянальная праблематыка займала значнае месца ў сацыялістычнай публіцыстыцы, паколькі сярод партый гэтага кірунку асабліва шмат было нацыянальных арганізацый. Яны распрацоўвалі падыходы, аб'ядноўваючы класавы і нацыянальны прынцыпы.

Паказальнай можа быць праца аднаго з ідэолагаў яўрэйскага сацыялістычнага руху У.Д. Медэма. Ён лічыў недастатковым наяўнасць грамадзянскага раўнапраўя як асноўнага фактара ліквідацыі нацыянальнага прыгнёту, і ставіў пытынне аб неабходнасці рэгламентацыі асобных устаноў у дадзенай вобласці пад апекай дзяржавы. Увага аўтара была накіравана на прапаганду ідэй культурнай аўтаноміі як «федэратыўнага саюза нацыянальных сеймаў», нешта накшталт «нацыянальнага самакіравання» [25, с. 38, 47–48, 54].

Такія ж палажэнні ўтрымліваліся і ў кнізе Х.О. Жытлоўскага. Ён характарызаваў нацыянальныя адметнасці як культурныя, і адпаведна, пераводзіў нацыянальныя праблемы ў вобласць культуры [15].

Пазіцыі прыхільнікаў культурна-нацыянальнай аўтаноміі ў Расійскай імперыі асбліва ўмацаваліся ў сувязі з выданнем, перакладзеных на рускую мову, прац вядомых тэарэтыкаў марксізму – О. Баўэра К. Рэнера [3; 32]. Іх пазіцыі падзялялі амаль усе сацыялістычныя нацыянальныя партыі [27].

Разам з тым, ідэя культурна-нацыянальнай аўтаноміі выклікала крытыку на левым флангу расійскай сацыял-дэмакратыі і перш за ўсё ў У.І. Леніна і яго прыхільнікаў. Яны лічылі, што культурна-нацыянальная аўтаномія перашкаджае класаваму адзінству пралетарыяту розных нацый і падштурхоўвае яго да супрацоўніцтва з нацыянальнай буржуазіяй. Нацыянальнае пытанне, такім чынам, разглядалася імі праз прызму класавага падыходу [23–24].

Своеасаблівую групу ў дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі складалі публікацыі дэпутатаў Дзяржаўнай думы 1–4 скліканняў, дзе аб'ектам увагі выступала нацыянальнае пытанне. Першая спроба разумення вопыту Дзяржаўнай думы першага склікання была зроблена кадэтамі. У 1907 г. у трох выпусках быў выдадзены зборнік матэрыялаў «Первая Государственная дума» [26]. Уяўляе цікавасць артыкул, які змешчаны ў гэтым зборніку, дэпутата ад Мінскай губерні, А.Р. Лядніцкага – «Национальный вопрос в Государственной думе». З'яўляючыся



лідарам першадумскай фракцыі аўтанамістаў, дэпутат звярнуў увагу на «імкненне асобных нацыянальнасцей да ўтварэння самастойных парламенцкіх груп», і што «сваёй задачай яны бачаць абмеркаванне і ахову ўсіх пытанняў, якія звязаны з правамі нацыянальнасцей і ідэяй цэнтралізацыі». Характарызуючы дзейнасць першага народнага прадстаўніцтва, якая тычылася нацыянальнага пытання, А. Лядніцкі адзначаў, што роспуск Думы не дазволіў ажыццявіць яе патрабаванняў, тым не менш, былі «вызначаны арыенціры, і той шлях па якому неабходна ісці для яго вырашэння» [22, с. 166].

Кадэт, прафесар М.А. Грэдэскул ахарактарызаваў падрыхтаваны ў яго партыі праект закона аб раўнапраўі і абмеркаванне яго ў Думе. Ён адзначыў, што «па пытаннях аб нацыянальнасцях і аб ураўнаванні ў правах асоб розных нацыянальнасцей і веравызнанняў дэбаты адбываліся па пытаннях аб раўнапраўі яўрэяў», а пытанне аб астатніх народах і веравызнаннях «заставалася як бы прыкрытым агульным прынцыпам раўнапраўя» [9, с. 129].

Адным з першых прааналізаваў нацыянальна-рэлігійны склад дэпутатаў І Дзяржаўнай думы М.А. Барадзін [4]. Па падліках даследчыка, «рускія ў парламенце мелі большую колькасць месц, чым на іх прыпадае ўвогуле». М.А. Барадзін адмаўляў сцвярджэнні правага друку, што Дума быццам «складаецца з палякаў і яўрэяў і, увогуле, іншародцаў» [5, с. 28–29, 31, 34].

Аднатыпнымі па сваім змесце былі публікацыі дэпутатаў, якія належалі да манархічных партый. Г.Г. Замыслоўскі, дэпутат ад Віленскай губерні, галоўную задачу бачыў у барацьбе з «іншародцамі» і «іншаверцамі» ў межах усёй імперыі, у першую чаргу ў Паўночна-Заходнім краі [17–19]. Такую пазіцыю падзялялі дэпутаты-нацыяналісты В.К. Тычынін, У.М. Пурышкевіч, М.М. Ладамірскі.

Абагульняючы характар насіў шматтомны зборнік артыкулаў і нарысаў «Общественное движение в России в начале XX века», які выдаваўся пад рэдакцыяй меншавісцкіх ідэолагаў Л. Мартава, П. Маслава і А. Патрэсава. У артыкуле Ф. Дана, які з'яўляўся адным з палітычных кіраўнікоў сацыял-дэмакратычнай фракцыі І і ІІ Дум, грунтоўна характарызаваліся тэндэнцыі дзяржаўнай палітыкі па нацыянальным пытанні. Па назіраннях Ф. Дана, І Дума хоць і адстойвала нацыянальнае раўнапраўе, але сама «спроба абмеркаваць нацыянальнае пытанне лёгка магла парушыць адзінства, да якога імкнулася кіруючая партыя Думы», таму яно так і «было пакінута адкрытым» [12, с. 14].

Заслугоўвае ўвагі артыкул, змешчаны ў гэтым жа зборніку, «Национальные движения». Аўтар К. Залеўскі – адзін са стваральнікаў Сацыял-дэмакратыі Царства Польскага і Літвы, адзначаў, што «нацыянальнае пытанне заўсёды адыгрывала вялікую ролю ў грамадскім жыцці, і ў дадзены момант выступае, як адно з найбольш запатрабаваных» [16, с. 151–243]. Для характарыстыкі развіцця нацыянальных градска-палітычных і культурна-асветніцкіх рухаў, палітычных праграм нацыянальных партый К. Залеўскі падзяліў усе народы імперыі «на 4 катэгорыі – 1) народы заходніх ускраін: палякі, літоўцы, латышы, эсты, маларосы і беларусы; 2) экстэрытарыяльная нацыя, якая насяляе розныя ўскраіны – яўрэі; 3) каўказскія народы: грузіны, армяне, татары; 4) іншародцы Сібіры і



РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

дробныя племянныя групы, паселеныя ва Усходняй і Паўночнай Расіі». Ён адзначыў, што нацыянальны рух практычна ва ўсіх народаў «праяўляецца ва ўздзеянні на Думу і культурную дзейнасць» і прыйшоў да высновы, што «ні ў адной з нацый нацыянальны рух не прымае формы такога руху, які пагражае існаванню дзяржавы; паўсюдна яго тэндэнцыі … супадаюць з тэндэнцыямі палітычнага развіцця дзяржавы такога тыпу, як Расія, што складаецца з рэгіёнаў, якія адрозніваюцца пэўнымі бытавымі ўмовамі і рознаплемянным складам насельніцтва». У заўвагах К. Залеўскі адзначае, што такім характарам адрозніваецца толькі рэвалюцыйная фракцыя Польскай партыі сацыялістычнай (ППС), аднак яна ў дадзены момант ніякай ролі ў палітычным жыцці Польшчы не адыгрывае [16, с. 226, 242].

Асаблівае месца ў гістарыяграфіі займае выдадзены ў 1910 г. пад рэдакцыяй А.І. Кастэлянскага зборнік «Формы национального движения в современных государствах», які напісаны інтэрнацыянальным калектывам аўтараў на матэрыялах трох імперый – Аўстра-Венгерскай, Расійскай і Германскай [31]. У раздзеле «Недержавные национальности и первые этапы национального строительства» былі змешчаны публікацыі М. Грушэўскага – аб украінцах, Р. Петэрсана – аб латышах, С. Дубнова – аб яўрэях, Л. Кржывіцкага і М. Ромера – аб палках Польшчы і Заходняга краю, З. Авалава – аб грузінах, С. Ціграняна – аб армянах. У гэты ж раздзел увайшоў артыкул А. Навіны (А. Луцкевіч) «Белорусы», дзе аўтар аналізуе матэрыялы перапісу 1897 г. Адзначаецца, што ў Расійскай імперыі пражывала 5885,5 тыс. беларусаў, што складала 4,7 % ад усяго насельніцтва краіны. Сярод іншых народаў імперыі беларусы па колькасці займалі 4-е месца пасля рускіх, украінцаў і палякаў. Звяртаецца ўвага на тое, што абсалютная большасць беларускага насельніцтва (5710 тыс. чалавек) была кампактна расселена на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю [31, с. 385]. Пытанні нацыі і нацыянальных адносін аналізаваліся ва ўступе А. Кастэлянскага і ў артыкуле «Национальность и государство» У. Вадавозава, а публікацыя У. Медэма «Национальное движение и национальные социалистические партии в России» вызначыла месца нацыянальнага пытання ў рэвалюцыйнай барацьбе гэтых партый.

Спробу разгледзець нацыянальнае пытанне ў Расійскай імперыі зрабіла Н. Брулова-Шаскольская [6]. Яна ахарактарызавала культуралагічныя і моўныя адрозненні велікаросаў, беларусаў, украінцаў і выказалася аб неабходнасці ўліку гэтых асаблівасцей пры будаўніцтве Расійскай дзяржавы.

Такім чынам, найбольш значны ўклад у дарэвалюцыйную гістарыяграфію нацыянальнага пытання зрабілі прадстаўнікі дзвюх палітычна-ідэалагічных кірункаў: спачатку гэту праблему паставілі аўтары ліберальнай публіцыстыкі, а затым да яе звярнуліся прадстаўнікі сацыялістычнай накіраванасці – сацыял-дэмакраты, народныя сацыялісты, трудавікі, дзеячы левых нацыянальных партый.

Абсалютную большасць дарэвалюцыйных прац немагчыма разглядаць у катэгорыі навуковых даследаванняў. Многім аўтарам, якія даследавалі нацыянальную праблематыку, не хапала навуковасці і шырыні поглядаў, што



тлумачыцца недаступнасцю дакументаў дзяржаўных органаў улады і матэрыялаў палітычных партый.

Увесь комплекс дарэвалюцыйнай літаратуры, з аднаго боку, дазваляе падыйсці да ацэнкі і асэнсавання нацыянальнага пытання ў 1905 – лютым 1917 г. з пазіцый палітычнага плюралізму, забяспечыць супастаўленне розных ідэалагічных пазіцый і выяўленне найбольш аб'ектыўнай карціны палітычнай барацьбы вакол нацыянальнай праблематыкі. З другога боку, нельга не прызнаць, што публіцыстычны характар асноўнай часткі выдадзеных прац, якія былі падпарадкаваны мэтам дзеючай палітычнай барацьбы, прадвызначаў значны суб'ектывізм аўтараў.

### *Літаратура і крыніцы*


1. Автономия, федерация и национальный вопрос. – СПб., 1906.
2. *Арцыбашцев, М.М.* Грядущая гибель России / М.М. Арцыбашцев. – СПб., 1908.
3. *Бауэр, О.* Национальный вопрос и социал-демократия / О. Бауэр. – СПб., 1909.
4. *Бородин, Н.А.* Государственная дума в цифрах / Н.А. Бородин. – СПб., 1906.
5. *Бородин, Н.А.* Личный состав первой Государственной думы, ее организация и статистические сведения о членах / Н.А. Бородин // Первая Государственная дума. – Вып. I: Политическое значение первой Думы. – СПб., 1907.
6. *Брюллова-Шаскольская, Н.* Национальный вопрос в России / Н. Брюллова-Шаскольская. – СПб., 1917.
7. *Будилович, А.С.* Может ли Россия отдать инородцам свои окраины? / А.С. Будилович. – СПб., 1907.
8. *Будилович, А.С.* По поводу об окраинах России / А.С. Будилович. – СПб., 1906.
9. *Гредескул, Н.* Проект закона о равноправии / Н. Гредескул // Первая Государственная дума. – Вып. II: Законодательная работа. – СПб., 1907.
10. *Гредескул, Н.А.* Россия и ее народы («Великая Россия» как программа разрешения национального вопроса в России) / Н.А. Гредескул. – Пг., 1916.
11. *Грушевский, М.* Единство или распадение России? / М. Грушевский. – СПб., 1907.
12. *Дан, Ф.* Общая политика правительства и изменения в государственной организации в период 1905 – 1907 гг. / Ф. Дан // Общественное движение в России в начале XX-го века; под. ред. Л. Мартова, П. Маслова и А. Потресова. – Т. IV. – Ч. II. – Кн. 7. – СПб.,1911.
13. *Драгоманов, М.П.* Политические сочинения / М.П. Драгоманов. – Т. I: Центр и окраины. – М., 1908.
14. *Ефремов, Г.А.* Национальные вопросы на инородческих окраинах России. Схема политической программы / Г.А. Ефремов. – СПб., 1908.
15. *Житловский, Х.* Социализм и национальный вопрос / Х. Житловский. – Киев-Петербург, 1906.
16. *Залевский, К.* Национальные движения / К. Залевский // Общественное движение в России в начале XX-го века; под. ред. Л. Мартова, П. Маслова и А. Потресова. – Т. IV. – Ч. II. – Кн. 7. – СПб., 1911.
17. *Замысловский, Г.Г.* «Умученные от жидов» / Г.Г. Замысловский // По актам Государственного Совета. – 2-е изд., доп. – СПб.: Тип. т-ва Суворина «Новое время». – 1914. – 80 с.
18. *Замысловский, Г.Г.* Польский вопрос в Государственной думе III созыва / Г.Г. Замысловский. – Вильно: Вестник Виленского православного святодуховского братства, 1908. – 157 с.
19. *Замысловский, Г.Г.* Развал высшей школы: речь Г.Г. Замысловского в заседании Государственной думы 20 апр. 1911 г. / Г.Г. Замысловский. – СПб.: Тип. Градоначальства, 1911. – 16 с.
20. *Ковалевский, М.* Национальный вопрос и равенство подданных перед законом / М. Ковалевский. – Варшава, 1906.




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

21. *Ковалевский, П.И.* Национальное воспитание и образование / П.И. Ковалевский. – СПб., 1910.
22. *Ледницкий, А.* Национальный вопрос в Государственной думе / А. Ледницкий // Первая Государственная дума. – Вып. I: Политическое значение первой Думы. – СПб., 1907.
23. *Ленин, В.* Критические заметки по национальному вопросу / В. Ленин // Просвещение. – 1913. – №№ 10, 11, 12.
24. *Ленин, В.* О праве наций на самоопределение / В. Ленин // Просвещение. – 1914. – № 4.– 6.
25. *Медем, В.* Социал-демократия и национальный вопрос / В. Медем. – СПб., 1906.
26. Первая Государственная дума. – Вып. I–III. – СПб., 1907.
27. Протоколы конференции российских национал-социалистических партий. – СПб., 1908.
28. *Рубакин, Н.А.* Национальный вопрос / Н.А. Рубакин // Среди книг. – Т. III. – Ч. I. – М., 1915.
29. *Сидоров, А.А.* Инородческий вопрос и идея федерализма в России / А.А. Сидоров. – М., 1912.
30. *Струве, П.Б.* На разные темы / П.Б. Струве. – СПб., 1902.
31. Формы национального движения в современных государствах. Австро-Венгрия. Россия. Германия / под. ред. А.И. Костелянского. – СПб., 1910.
32. *Шпрингер, Р.* (Реннер К.). Национальная проблема (Борьба национальностей в Австрии) / Р. Шпрингер. – СПб., 1909.

## ИСТОРИОГРАФИЯ ПРОБЛЕМЫ ФОРМИРОВАНИЯ БЕЛОРУССКОЙ НАЦИОНАЛЬНО-ГОСУДАРСТВЕННОЙ ИДЕИ (КОНЕЦ XIX – НАЧАЛО XX в.)

***В.И. Толкачёв, г. Минск***

В процессе становления и развития нации важное место занимает сохранение языка, культуры, этнических традиций, формирование исторической памяти и идентификация себя с далекими предками как носителями генетической памяти и наследия. Белорусская национальная идея, аккумулировав в себя многообразие различных явлений, процессов и познаний, опирается на следующие факторы:

- духовный опыт западноевропейских и русской традиций;
- социально-политические идеи белорусской и мировой философии различных периодов;
- философско-публицистические исследования XVI–XX вв.;
- литературно-художественное творчество деятелей белорусской культуры.

В начале XX в. белорусская территория оказалась глубоко инкорпорированной в общероссийскую общественно-политическую систему. С одной стороны, это в определенной степени тормозило формирование национально-ориентированной элиты, сдерживало более активное развитие национального самосознания. С другой стороны – российские общественно-политические процессы, создание и деятельность общероссийских политических партий начинают оказывать существенное влияние на рост политической активности передовых кругов белорусской общественности, втягивание их в глубинные политические процессы.



В 1902–1903 гг. из национально-культурных кружков студенческой молодежи и молодых работников, части местной интеллигенции Минска, Вильно, С.-Петербурга и других городов была создана национально-политическая партия – Белорусская Социалистическая Громада. Исследованию некоторых направлений ее деятельности посвятил работу один из организаторов партии А. Луцкевич [1]. Он, в частности, отмечал, что одной из основных задач партии «было ладжанньне сялянскіх забастовак….дзеля здабыцця лепшых варункаў працы і прывучэння массы да самастойнасці і арганізаваных выступленняў» [1, с.15].

Дальнейшую конкретизацию и развитие идеи формирования и консолидации белорусской нации, самостоятельного и свободного развития белорусского народа находят в публикациях первых белорусских газет «Наша доля» (1905 г.) и «Наша нива» (1906–1915 гг.). Именно с деятельностью газет связана разработка таких важных направлений как национальное самосознание, национальная культура и государственность, язык, традиции, внедрение в народное сознание понятий «единый белорусский народ», «нация», «родная сторона» и т. д. Роль газеты «Наша нива» в развитии белорусской политехнической, экономической и культурной мысли анализируется в монографии А.В. Унучека «Наша ніва» і беларускі нацыянальны рух (1906–1915 г.) [2]. В ней автор рассматривает влияние газеты на идеологию белорусского национального движения, связь социал-демократизма и белорусской национальной идеи.

В развитие, научное обоснование и осмысление белорусской национальной идеи, определению белорусов как самостоятельной нации, имеющей самобытную историю, культуру и язык, внесли труды известных белорусских ученых, филологов и литераторов таких как М.В. Довнар-Запольский, Е.Ф. Карский, А. Цвикевич, Ф. Богушеевич, М. Богданович, В.Ю. Ластовский и др. [3].

Белорусское национальное движение значительно активизируется после Февральской революции (1917 г.) и свержения царского самодержавия. В 1918–1922 гг. национально-патриотические силы предпринимают ряд попыток формирования белорусского государства и его нормативно-правового оформления. Деятельность белорусских партий и организаций по реализации идеи белорусской государственности нашла освещение в трудах непосредственных участников этих событий: Я. Воронко, А. Цвикевича, А. Луцкевича, В. Гадлевского, Д. Жилуновича, В. Кнорина [4].

С современных позиций исследование становления белорусской государственности, стратегии и тактики политических сил, разработке темы международной правосубъектности Беларуси посвящены работы В.Ф. Ладысева, П.И. Бригадина, В.А. Круталевича, А.В. Тихомирова, С.С. Рудовича, С.Д. Третьяка и др. [5].

Исследователь Ф.Турук в работе «Белорусское движение» [6] на основе многочисленных фактов, статистических данных рассматривает процесс формирования национальной идеи в программных документах и деятельности политических партий и движений. Он аргументирует свои методологические позиции на материалах и документах, связанных с белорусским просветительством, революционным движением и деятельностью БСГ.